ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
13.03.2024 № 29

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» для V–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» (далей – вучэбная праграма) арыентавана на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў у галіне маралі і ў сацыяльна-грамадзянскай сферы ў працэсе праектнай дзейнасці пры вывучэнні вучэбных прадметаў гуманітарнай адукацыі і прызначана для вучняў V–IX класаў (2 гады навучання, магчымы рознаўзроставыя групы) установаў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі (далей – установы адукацыі).

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 70 гадзін (першы год навучання – 35 гадзін, 1 гадзіна на тыдзень; другі год навучання – 35 гадзін, 1 гадзіна на тыдзень).

Змест вучэбнага матэрыялу структураваны ў 9 модуляў. Колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы модуля з’яўляецца прыкладнай і залежыць ад відаў дзейнасці, якія арганізуе педагагічны работнік, а таксама вучэбна-пазнавальных магчымасцей вучняў. Педагагічны работнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў, улічваючы іх асабісты вопыт.

3. Мэта факультатыўных заняткаў – фарміраванне асобы, здольнай адэкватна ўспрымаць і ацэньваць дасягненні духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі, гатовай да дзейнасці па законах дабра, сумлення, гонару, справядлівасці, патрыятызму і грамадзянскага абавязку.

4. Задачы факультатыўных заняткаў:

фарміраванне маральнай культуры вучняў;

фарміраванне асноў грамадзянскай ідэнтычнасці, выхаванне пачуцця гонару за сваю краіну, свой народ;

актуалізацыя ўяўленняў вучняў пра магчымасць і неабходнасць выкарыстання каштоўнасцей духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі ў жыццядзейнасці сучаснага чалавека;

захаванне гістарычнай памяці рэгіёна і краіны;

фарміраванне экалагічнай культуры вучняў як састаўнога кампанента агульнай культуры;

фарміраванне ўменняў і навыкаў крытычнага чытання, аналізу, параўнання, абагульнення; выбудоўвання аналогій і прычынна-выніковых сувязей, класіфікацыі з’яў; падрыхтоўкі лагічных і крытычных выказванняў;

набыццё вопыту камунікатыўнай, праектнай, даследчай, пошукавай, творчай дзейнасці з прыцягненнем розных крыніц інфармацыі для

самастойнага выкарыстання раней засвоеных ведаў і ўменняў у новых сітуацыях;

фарміраванне асноў мастацкай культуры;

пашырэнне вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці.

5. Арганізацыя факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» ў галіне маралі і сацыяльна-грамадзянскай сферы прадугледжвае розныя віды і формы дзейнасці, якія забяспечваюць уздзеянне на асобу вучня, раскрыццё індывідуальных і псіхалагічных асаблівасцей, якія не заўсёды магчыма разгледзець падчас адукацыйнага працэсу. Пазакласная дзейнасць спрыяе ўзбагачэнню асабістага вопыту вучняў праз засваенне імі новых відаў дзейнасці і набыццё неабходных практычных уменняў і навыкаў.

У розных формах арганізацыі пазакласнай дзейнасці вучні актыўна засвойваюць сістэмы міжасобасных узаемадзеянняў, вучацца супрацоўніцтву. Асноўнымі формамі работы могуць быць: індывідуальныя і групавыя практычныя заняткі, экскурсіі, гутаркі, сустрэчы са знакамітымі людзьмі рэгіёна (прадстаўнікамі культуры, навукоўцамі, перадавікамі вытворчасці і іншымі), тэматычныя выставы, гульні, акцыі, конкурсы, інтэрв’ю, фотарэпартажы, эсэ, паведамленні, артыкулы і іншыя. Метад праектнай дзейнасці дазваляе выкарыстоўваць веды, атрыманыя ў ходзе вучэбнай дзейнасці, на практыцы; фарміраваць актыўную, ініцыятыўную і самастойную пазіцыю вучняў; развіваць даследчыя, творчыя, самаацэначныя, рэфлексіўныя навыкі. Вынік кожнага праекта можна убачыць, асэнсаваць і прымяніць на практыцы. Праектная дзейнасць спрыяе развіццю самастойнага мыслення, самаарганізацыі, супрацоўніцтву з дарослымі і аднагодкамі, а таксама творчаму і эстэтычнаму выхаванню асобы.

Рэкамендуецца пастаноўка сітуацыйных задач маральнага зместу, выкарыстанне адпаведных аўдыёвізуальных матэрыялаў, фільмаграфіі, віртуальных экскурсій і гэтак далей.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме, і патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

6. У выніку засваення дадзенай вучэбнай праграмы вучні павінны:

ведаць:

нацыянальную культурную спадчыну (творы нацыянальнай мастацкай культуры; рэгіянальныя асаблівасці беларускай нацыянальнай культуры; літаратурную і дыялектычныя формы беларускай мовы; аб’екты экскурсійных маршрутаў; абрады як частку традыцыйна-бытавой культуры; нацыянальную кухню рэгіёна);

знакамітых асоб мясцовасці;

прыродныя асаблівасці мясцовасці (флора, фаўна, водныя аб’екты);

прадпрыемствы рэгіёна (структура, тэхналагічны працэс, прадукцыя, эканамічныя сувязі, экалагічныя пытанні);

умець:

успрымаць і ацэньваць дасягненні духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі;

успрымаць мастацкія творы, якія адлюстроўваюць розныя этнакультурныя традыцыі;

ацэньваць найбольш значныя падзеі, з’явы айчыннай культуры;

шанаваць нацыянальную культуру, традыцыі і культуру сваёй краіны, традыцыі іншых народаў; паважаць культурную разнастайнасць;

вырашаць сітуацыі маральнага выбару, прымаць адказнасць за свае рашэнні;

вызначаць ролю знакамітай асобы, яе ўклад у развіццё маральнай культуры краіны і значэнне для маладога пакалення;

выяўляць своеасаблівасць беларускай мовы і яе дыялектычную разнастайнасць;

даследаваць і аналізаваць з’явы прыроды;

распаўсюджваць экалагічныя веды і ўдзельнічаць у ахове навакольнага асяроддзя;

будаваць сумесную дзейнасць у адпаведнасці з вучэбнай задачай і культурай калектыўнай работы;

праводзіць пошук асноўнай і дадатковай інфармацыі ў вучэбнай і навукова-папулярнай літаратуры, бібліятэках і музеях, інтэрнэце; апрацоўваць яе ў адпаведнасці з тэмай і пазнавальнымі заданнямі;

працаваць з гістарычнымі крыніцамі і дакументамі;

выкарыстоўваць у новых сітуацыях інфармацыю, самастойна атрыманую з разнастайных крыніц;

выкарыстоўваць камп’ютарныя тэхналогіі;

прэзентаваць вынікі праектнай, даследчай, пошукавай і творчай дзейнасці;

валодаць:

устойлівасцю маральных якасцей, што праяўляюцца ў магчымасці пераносу сфарміраваных у пэўных жыццёвых сітуацыях маральных поглядаў, адносін і спосабаў паводзін у новыя, якія раней не мелі месца ў жыцці чалавека, сітуацыі;

камунікатыўнымі ўменнямі, актыўна і адэкватна выкарыстоўваць моўныя сродкі для вырашэння задач узаемадзеяння (весці дыялог, выказваць сваю думку і аргументаваць сваю пазіцыю);

метадамі пазнання і лагічнымі дзеяннямі (параўнанне, аналіз, абагульненне, пабудова разважанняў);

навыкамі пошуку і крытычнага адбору інфармацыі; чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў, работы з інфармацыяй, прадстаўленай у розным выглядзе і разнастайнай форме;

вопытам камунікатыўнай, праектнай, даследчай і творчай дзейнасці, самастойнай мастацка-творчай дзейнасці.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Першы год навучання
### 35 гадзін

Уводзіны ў праектную дзейнасць (1 гадзіна). Праектная дзейнасць: паняцце праектнай і вучэбна-даследчай дзейнасці. Праект. Прэзентацыя.

Тэматычны агляд праектаў факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца».

Модуль 1. Свая хатка – як родная матка (7 гадзін)

Архітэктура, дойлідства, быт мясцовасці. Прадметы хатняга ўжытку. Умоўныя абазначэнні плана і пашпарта гістарычнага збудавання. Даследаванне гістарычнага збудавання мясцовасці. Асаблівасці складання пашпарта і схемы гістарычнага збудавання.

Практычныя заняткі

Складанне карты славутасцей мясцовасці. Складанне слоўных партрэтаў герояў мастацкіх твораў. Чытанне схем гістарычных збудаванняў. Сістэматызацыя ўмоўных абазначэнняў планаў (схем, чарцяжоў). Складанне анатацыі помніка архітэктуры.

Праектная дзейнасць. «Пашпарт і схема гістарычнага збудавання мясцовасці».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 2. Нашу дачку пазнаюць і ў андарачку (7 гадзін)

Беларускі нацыянальны строй. Нацыянальны арнамент. Асаблівасці нацыянальнага касцюма мясцовасці. Сучаснае адзенне і аксесуары ў нацыянальным стылі. Гардэроб і асаблівасці яго складання.

Практычныя заняткі

Складанне пашпарту нацыянальнага строю. Чытанне карты разнавіднасцей сялянскага строю па рэгіёнах. Параўнанне нацыянальных касцюмаў розных рэгіёнаў Беларусі. Падрыхтоўка паведамленняў пра

знакавых дзеячаў беларускай культуры і значныя культурныя падзеі краіны.

Праектная дзейнасць. «Сучасны базавы жаночы (мужчынскі) гардэроб з нацыянальнымі элементамі мясцовасці».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 3. Што хутарок – то гаварок, што сяльцо – то слаўцо (6 гадзін)

Дыялектная форма беларускай нацыянальнай мовы. Мясцовая гаворка рэгіёна. Азначэнні мясцовай гаворкі. Структура навуковага артыкула ў слоўніку.

Практычныя заняткі

Знаёмства з тэкстамі «жывой народнай мовы» Беларусі, іх аналіз. Складанне карты тапонімаў мясцовасці. Рэканструкцыя беларускіх гульняў нашых продкаў.

Праектная дзейнасць. Слоўнік «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 4. Смачна было, ды блізка дно (5 гадзін)

Нацыянальная кулінарная і гастранамічная культура Беларусі на падставе як народнай, так і арыстакратычнай кухні (сялянская, мяшчанская, шляхецкая і магнацкая): спецыфіка, спосабы гатавання. Структура кнігі рэцэптаў.

Практычныя заняткі

Падрыхтоўка інтэрв’ю. Знаёмства з мастацкімі тэкстамі, іх аналіз. Наведванне віртуальных экскурсій. Складанне тэхналагічных карт мясцовых страў. Падрыхтоўка меню. Калькуляцыі колькасці і кошту прадуктаў меню, часу, патрэбнага для гатавання. Гатаванне мясцовых страў.

Праектная дзейнасць. Кніга рэцэптаў«Мясцовыя стравы».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 5. На ўсё свае песні: на вяселлі вясельныя, а на хрысцінах хрысцінныя (9 гадзін)

Абрады як частка традыцыйна-бытавой культуры. Сямейна-абрадавы комплекс (нараджэнне – хрышчэнне – вяселле, пахаванне і памінанне). Мясцовыя асаблівасці народных абрадаў і звычаяў. Структурныя кампаненты сцэнарыя. Спевы ў абрадах і іх значэнне. Алгарытм развучвання народных песень. Складнікі музычна-тэатральнага дзеяння.

Практычныя заняткі

Апытанне старажылаў пра народныя традыцыі. Знаёмства з літаратурнымі тэкстамі, іх аналіз. Падрыхтоўка сцэнарыяў. Развучванне песень. Рэканструкцыя фрагментаў абрадаў.

Праектная дзейнасць. Музычна-тэатральнае дзеянне «Мясцовы абрад». Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Другі год навучання
35 гадзін

Модуль 6. Добрая дарога – карацейшы шлях (8 гадзін)

Экскурсія. Мясцовыя культурныя аб’екты. Маршрут экскурсіі. Аб’екты маршруту. Тэхналагічная карта экскурсіі.

Практычныя заняткі

Падбор гістарычных фотаздымкаў і малюнкаў мясцовасці, пошук гістарычных карт мясцовасці. Складанне інфармацыйных тэкстаў да ілюстрацыйнага матэрыялу экскурсійнага маршруту. Складанне тэксту расказу пра аб’ект экскурсіі. Складанне схематычнага плана і аб’ектаў маршруту.

Праектная дзейнасць. Экскурсійны маршрут «Па мясцовых славутасцях».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 7. Добрая слава далёка чуваць (7 гадзін)

Знакамітая асоба. Яе жыццё і дзейнасць. Роля асобы ў жыцці краіны, яе ўклад у развіццё рэгіёна. Якасці асобы, вартыя для наследавання. Кампаненты літаратурнага нарыса.

Практычныя заняткі

Запіс аповедаў калег, сваякоў. Падрыхтоўка інтэрв’ю. Знаёмства з навуковымі тэкстамі, іх аналіз. Складанне храналагічнай табліцы лёсавызначальных этапаў жыцця і творчасці. Падрыхтоўка інструкцыі. Падрыхтоўка сустрэчы знакамітай асобы з вучнямі ўстановы адукацыі.

Праектная дзейнасць. Партрэтны нарыс (нататка) у «Краязнаўчую газету» пра знакамітую асобу мясцовасці.

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 8. Чалавек жыве век, а добрае дзела – два (11 гадзін)

Прамысловасць рэгіёна. Месца і роля прадпрыемства ў эканоміцы краіны. Уплыў на фарміраванне галіны вытворчасці ў рэгіёне(краіне, свеце). Гісторыя і перадумовы (сацыяльна-эканамічная, прыродна-экалагічная, дэмаграфічная база) развіцця вытворчасці на тэрыторыі рэгіёна. Сыравіна, спажыўцы, работнікі, збыт прадукцыі і гэтак далей.

Прадпрыемства ў постацях. Перспектывы развіцця прадпрыемства. Рэкламны буклет і яго структура.

Практычныя заняткі

Складанне карты транспартных шляхоў па здабычы сыравіны (збыту прадукцыі). Складанне дыяграмы аб'ёму вытворчасці прадукцыі з моманту заснавання прадпрыемства да нашых дзён. Разлік прагназуемых паказчыкаў эфектыўнасці работы прадпрыемства (прыбытку) на аснове дыяграмы. Аналіз эканамічнай эфектыўнасці прадпрыемства.

Праектная дзейнасць. Рэкламны буклет «Прамысловае (сельскагаспадарчае) прадпрыемства рэгіёна».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.

Модуль 9. На добрай зямлі добрая надзея (9 гадзін)

Насельніцтва, сям'я, адукацыя, будаўніцтва, транспартныя сродкі, прадпрыемствы, прафесіі, клімат, экалогія, тэхналогіі, медыцына ў будучыні. Методыка падрыхтоўкі і правядзення выставы.

Практычныя заняткі

Падрыхтоўка слоўніка прафесій. Складанне графікаў змянення колькасці насельніцтва мясцовасці, фінансава-эканамічнага развіцця мясцовасці. Распрацоўка плана развіцця мясцовасці ў 2050 г. Падрыхтоўка прапаноў назваў вуліц для тапанімічнай камісіі. Кліматычны і экалагічны прагноз рэгіёна.

Праектная дзейнасць. Выстава «2050. Рэгіён вачамі дзяцей».

Прэзентацыя праекта. Рэфлексія.